

"Сярэдзіна лета",
Ян Люцзін

# Гармонія, якая сцірае межы

**У Мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" адкрылася выстава жывапісу магістранткі БДУКМ з Кітайскай Народнай Рэспублікі Ян Люцзін "Вобразы Кітая". У экспазіцыі прадстаўлены работы, выкананыя ў класічным кітайскім стылі гохуа.**

Займаецца жывапісам Ян Люцзін ужо дзевяць гадоў. Засвоіла асновы мастацтва дома, а ў Беларусі паступіла ў магістратуру. Выбар краіны не быў выпадковым: тут жыве сваяк мастачкі, які парэкамендаваў прыехаць на вучобу менавіта ў Мінск. Калекцыя, прадстаўленая сёння, была створана Ян Люцзін пасля прыезду ў Беларусь, калі дзяўчына пачала моцна сумаваць па радзіме: "Мне вельмі хацелася перадаць сваю любоў і тугу па Кітаі, яго вытанчаных пейзажах, а таксама паказаць беларускаму гледачу спецыфіку кітайскай культуры. Я спадзяюся, што наведвальнікі змогуць адчуць тыя матывы і вобразы, якія я імкнулася адлюстраваць у сваіх карцінах". У працах мастачкі адчуваецца нябачная прысутнасць духоўнасці і ўнутранай гармоніі. Дадатковую глыбіню і сімвалізм мінімалістычным кітайскім пейзажам надаюць тонка падабраныя адценні колераў, кампазіцыя, а таксама авеяныя ўсходняй філасофіяй назвы.

"Я адчуваю гонар за нашу студэнтку, якая ў сваіх працах адлюстроўвае эмоцыі, перажытыя тут, і веды, атрыманыя не толькі ў сябе на радзіме, але і ў нашым універсітэце, — кажа куратар мастачкі, магістр культуралогіі **Вольга Вярбіцкая**. — Хочацца падзякаваць Ян Люцзін, бо яна стварае магчымасць дыялогу паміж нашымі культурамі і спрыяе іх узаемаўзбагачэнню. Сёння мы гаворым на адной мове — мове мастацтва".

Свае карціны Ян Люцзін піша ў спакойнай абстаноўцы, у адзіноце. Менавіта такая атмасфера дапамагае настроіцца на больш цесны кантакт з інструментамі, якія яна выкарыстоўвае ў працы. "Звычайна я пішу дома, таму што для стварэння карцін у дадзеным стылі неабходныя спецыяльныя інструменты, якія нязручна размяшчаць у іншым месцы", — дзеліцца мастачка. Сёння сярод яе работ — класічныя кітайскія пейзажы, кветкі і птушкі. Аднак Ян Люцзін прызнаецца, што ў хуткім часе плануе напісаць і Беларусь: "Мне вельмі спадабаліся Мінскі чыгуначны вакзал і беларускія храмы. Хацелася б намаляваць менавіта гэтыя архітэктурныя будынкі".

Выстава "Вобразы Кітая" працягнецца да 23 мая.

**Яўгенія ГАБЕЦ**